# Узнагароды для найлепшых

За шматгадовую плённую працу і значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры **Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь** узнагароджаны рэжысёр народнага тэатра гульні і гумару "Капыльскія пацехі" Капыльскага раённага цэнтра культуры **Любоў Галубовіч**, дырэктар музея "Замкавы комплекс «Мір»" **Аляксандр Лойка** і вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы **Уладзімір Рагаўцоў**.

За шматгадовую плённую працу і значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры **Падзяка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь** абвешчана загадчыку сектара абслугоўвання дзіцячага чытача Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма Танка **Святлане Кайко**, генеральнаму дырэктару камунальнага ўнітарнага прадпрыемства "Гомелькінавідэапракат" **Аляксандру Лаўрыненку** і настаўніку па класе скрыпкі гродзенскай дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 1 імя Ю. У. Семянякі **Наталлі Ткачовай**.

За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай культуры **Падзякі Прэм'ер-міністра** ўдастоілася дырэктар Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Н. Ф. Сакалоўскага **Таццяна Пузырэнка**.

За шматгадовую добрасумленную працу, паспяховы ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і абласных конкурсах, значны ўклад у развіццё беларускага харэаграфічнага мастацтва **Падзякай Прэм'ер-міністра** ўганараваны Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца "Лялечкі" Абухаўскага цэнтра культуры Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра (кіраўнік — **Таццяна Урбановіч**).

За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры ды мастацтва **нагрудным знакам Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі"** ўзнагароджаны загадчык юнацкага аддзела Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна **Марына Елісеева**, дырэктар Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці **Кацярына Лабука** і дырэктар Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі **Аляксей Снітко**.

За высокі прафесіяналізм і значны асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнай культуры **Ганаровую грамату Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь** атрымала начальнік Галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта **Ала Шахоцька**.

Па выніках рэспубліканскага конкурсу на найлепшую работу ў сферы культуры сярод упраўленняў культуры **дыплома III ступені** і грашовай прэміі ў памеры 50 базавых велічынь удастоена Упраўленне культуры **Магілёўскага** абласнога выканаўчага камітэта, **дыплома II ступені** і грашовай прэміі ў памеры 75 базавых велічынь — Упраўленне культуры **Віцебскага** абласнога выканаўчага камітэта, а **дыплома I ступені** і грашовай прэміі ў памеры 100 базавых велічынь — Упраўленне культуры **Гродзенскага** абласнога выканаўчага камітэта.

З падпарадкаваных Міністэрству культуры арганізацый дыпламам і грашовай прэміяй у памеры 50 базавых велічынь сярод тэатральна-відовішчных арганізацый, якія маюць уласную сцэнічную пляцоўку, уганараваны **Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь**, сярод тэатральна-відовішчных арганізацый, якія не маюць уласнай сцэнічнай пляцоўкі, — **Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры"**, сярод культурна-асветніцкіх устаноў — **Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур**, а сярод устаноў адукацыі — **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў**.



Ігар Сергяенка ўзнагароджвае Аляксандра Лойку



Таццяна Урбановіч атрымала ўзнагароду з рук Ігара Петрышэнкі




Анатолій Маркевіч уручае дыплом Кацярыне Дулавай